**З пісьмаў** Міхаіла Шэўчанкі родным // Памяць. Верхнядзвінскі раён : гісторыка-дакументальныя хронікі гарадоў і раёнаў Беларусі : у 2 кн. / рэдкал.: У. С. Богаў [і інш.] ; уклад. А. Ф. Бубала ; маст. Э. Э. Жакевіч. — Мн. : Паліграфафармленне, 2000. — Кн. 2. — С. 208.

## З ПІСЬМАЎ МІХАІЛА ШЭЎЧАНКІ РОДНЫМ

*Прывітанне з Кундуза. Добры дзень, мае дарагія родныя! З палымяным салдацкім прывітаннем ваш сын Міхаіл. Даруйце за доўгае маўчанне, але я спадзяюся, што вы мяне зразумееце... Мамачка, думаў я думаў, круціў і так і гэтак, але нічога не здолеў прыдумаць. І тады вырашыў, хай лепш горкая праўда, чым падман. Мама, толькі ты не ўпадай у роспач, будзь мужнай. Са мною ўсё добра. Гэты горад знаходзіцца ў Афганістане. Не бядуйце, я служу ў сваёй дывізіі і займаюся справай па спецыяльнасці. Хаджу ў нарады і ўсё... Сёння аблысіўся налыса. Тут вельмі горача і пыльна, усе так ходзяць. Зараз спякота да 50°. Ды буду прывыкаць, бо мне служыць тут яшчэ доўга...*

*... Служба ідзе, як і раней. Час ляціць хутка. А як стану ездзіць на аперацыі, пойдзе яшчэ хутчэй. Надвор'е з кожным днём усё гарачэй, усё навокал стала нібы порах, адно ваду гоніш ды гоніш, есці не хочацца. Кормяць тут выдатна, кожны дзень фільмы. Часта прывозяць канцэрты... Мяркую, што служыць тут лепей, чым у Саюзе. Адна толькі розніца, што тут ідзе неаб'яўленая вайна. Да страляніны ўжо прывык, нават не звяртаю ўвагі...*

*...Да спякоты прывык. Пэўна, як прыеду дадому, буду замярзаць... Мама, ты пішаш, каб я служыў так, каб вам за мяне не было сорамна. Дык я запэўніваю, што за мяне сорамна не будзе, як бы там ні сталася. З нецярплівасцю чакаю ліста ад пляменніка, спадзяюся, ён з бабуляй дзядзьку напіша. Пішыце, як вы там. Добра, хоць сена накасілі. Шкада, што мяне там не было...*

*Прывітанне з Кундуза. Добры дзень, дарагія родныя! Паведамляю вам, што я жывы і здаровы, чаго і вам жадаю. Служба мая ідзе нармальна. Ужо хутка загад. А там і год застанецца. Памаленьку цягнем нарады. Але хутка павінна прыехаць замена, і ў нарады не будзем хадзіць. Іншы раз бывае і выездаў няма, ходзіш па палку з кутка ў кут, ледзь не шалееш. Але вечарам хоць фільм паглядзіш, душу адвядзеш.*

*Напішыце, дзе працуе Шэнда М. Ці скончыў Колька Кудраўцаў тэхнікум, а Мітрохін так-сама? Пішыце, як ваша здароўе, што ў вас новага. Перадавайце прывітанне Валодзю, Тані, Сярожу. Як ён там, вялікі ўжо? Вышліце яго фотку, я вельмі чакаю. Я яму пісьмо напісаў, чакайце. Пра мяне не перажывайце. Не нервуйцеся дарма. Я ж выконваю інтэрнацыянальны абавязак Савецкага салдата. І не зганьбую сябе і вас. Пішыце, ці пачалі вы капаць бульбу і ці добрая яна? Я б зараз паеў дамашняй. А то тут як гумавая і без смаку. Надвор'е, як і раней. Спякота пачала пакрыху сціхаць. Вось і ўсё. Да пабачэння. Чакаю хуткага адказу. Міша. Перадайце прывітанне суседзям. Чакаю адказу...*

*1982*